ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

# СМІ Ў БЕЛАРУСІ

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

ЛІСТАПАД–СНЕЖАНЬ 2014



baj.by

*Віртуальнае асяроддзе з'яўляецца найбольш магутным чыннікам уплыву на насельніцтва. Пры гэтым далёка не заўсёды інтэрнэт служыць развіццю грамадства і дзяржавы. У сувязі з гэтым інтэрнэт, пры пасярэдніцтве якога распаўсюджваецца прадукцыя СМІ, з'яўляецца дэ-факта сродкам масавай інфармацыі і патрабуе адэкватнага заканадаўчага рэгулявання.*

*Лілія Ананіч, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

*Паколькі традыцыйныя сродкі масавай інфармацыі ўжо заціснутыя, урад засяродзіў свае намаганні на цэнзуры інтэрнэту – апошняй пазасталай прасторы для распаўсюду незалежных навінаў і меркаванняў у Беларусі. Мы заклікаем урад адмяніць гэтыя абмежаванні.*

*Ніна Агнянава, Камітэт абароны журналістаў, Нью-Ёрк (CPJ)*



# СОДЕРЖАНИЕ:

**Становішча ў галіне СМІ ў лістападзе-снежні 2014 г. (агляд). . . . . . . . . . 4**

**Асноўныя падзеі ў сферы СМІ ў лістападзе-снежні 2014 г. . . . . . . . . . . . . . . 4**

**Рэйтынгі, індэксы, статыстыка . . . . . . . . . . . . 9**

# СТАНОВІШЧА Ў ГАЛІНЕ СМІ Ў ЛІСТАПАДЗЕ-СНЕЖНІ 2014 Г. (АГЛЯД)

Становішча ў галіне СМІ ў Беларусі напрыканцы 2014 г. рэзка пагоршылася, прычым на сістэмным узроўні.

У спешным парадку былі ўнесеныя змены ў закон “Аб сродках масавай інфармацыі”, якія ўзмацнілі кантроль уладаў за Інтэрнэтам і распаўсюдам прадукцыі традыцыйных СМІ.

Сярод іншых сур’ёзных парушэнняў свабоды выказвання меркаванняў у Беларусі ў лістападзе-снежні вылучаліся наступныя:

- **працяглае блакаванне некалькіх незалежных Інтэрнэт-СМІ;**
- **судовы пераслед журналістаў;**
- **узбуджэнне крымінальнай справы супраць журналіста па абвінавачанні ў дзяржаўнай здрадзе.**

# АСНОЎНЫЯ ПАДЗЕІ Ў СФЕРЫ СМІ Ў ЛІСТАПАДЗЕ-СНЕЖНІ 2014 ГОДА

## УНЯСЕННЕ ЗМЕНАЎ У ЗАКОН АБ СМІ

У снежні 2014 г. улады ў тэрміновым парадку ўнеслі змены ў закон “Аб сродках масавай інфармацыі”, датычныя, у першую чаргу, анлайн-рэсурсаў. Ніжняя палата Нацыянальнага сходу ўхваліла іх адра-

зу ў двух чытаннях 17 снежня, верхняя зацвердзіа 18 снежня, а прэзідэнт падпісаў абноўлены закон 20 снежня. У сілу ён уступіў з 1 студзеня 2015 г.



Згодна з гэтым дакументам Міністэрства інфармацыі атрымала права блакаваць доступ да анлайн-рэсурсаў без рашэння суда. Уладальнікі Інтэрнэт-рэсурсаў абавязваюцца адсочваць каментары наведнікаў сваіх сайтаў. Фактычна ўсе Інтэрнэт-рэсурсы цяпер прыраўняныя паводле сваіх абавязкаў да СМІ (з яшчэ больш жорсткімі мерамі адказнасці, якія накладаюцца на іх уладальнікаў у пазасудовым парадку), але правоў СМІ не атрымалі.

Змены ў законе таксама пагоршылі становішча і традыцыйных СМІ. Сярод іншага, цяпер закон абавязвае распаўсюднікаў друкаваных і тэлерадыёвяшчальных СМІ рэгістравацца ў Міністэрстве інфармацыі і надае міністэрству паўнамоцтвы пазбаўляць іх права на распаўсюд СМІ.

> **“Гэтыя папраўкі грунуюцца на недакладна сфармуляваных прававых палажэннях і даюць дзяржаве шырокія правы для ўмяшальніцтва ў размяшчэнне любой інфармацыі ў інтэрнэце, – гаворыцца ў звароце Прадстаўніка АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ да беларускага ўрада. – Яны таксама накладаюць на распаўсюднікаў інфармацыі функцыі квазі-цэнзуры”.**

## БЛАКАВАННЕ НЕЗАЛЕЖНЫХ АНЛАЙН-СМІ

Адначасова з прыняццем папраўак у Закон аб СМІ былі заблакаваныя адразу некалькі асноўных незалежных сайтаў.




Беспрэцэдэнтнае паводле масавасці і працягласці блакаванне анлайн-СМІ пачалося 19 снежня. Без тлумачэння прычын быў абмежаваны доступ беларускіх карыстальнікаў да трох сайтаў зарэгістраванай інфармацыйнай кампаніі БелаПАН (belapan.com, belapan.by и naviny.by), а таксама да сайтаў belaruspartisan.org, charter97.org, udf.by, 21.by, gazetaby.com, zautra.by і некаторых іншых Інтэрнэт-рэсурсаў.

Толькі ў адным выпадку дзяржава ўзяла на сябе адказнасць за блакаванне пасля абвінавачвання парталу onliner.by у парушэнні правілаў інтэрнэт-гандлю. Тым не менш, паводле ацэнак экспертаў, блакаванне сайтаў адбывалася з боку "Белтэлекама" (дзяржаўнай тэлекамунікацыйнай кампаніі, якая забяспечвае шырокапалосны доступ у Інтэрнэт). Доступ да некаторых сайтаў быў абмежаваны ажно да канца 2014 г., а таксама ў пачатку 2015 г.

**Найбольш верагодна, што нагэтульні сур'ёзная атака была звязаная з рэзкім скачком зацікаўленасці беларусаў у аб'ектыўнай інфармацыі праз чарговы валютны крызіс у краіне. Таксама магчыма казаць пра тое, што дадзенае блакаванне сталася пэўнага кшталту трэніроўкай напярэдадні надыходзячай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 2015 г. і паказчыкам таго, як можа выглядаць інфармацыйная прастора Беларусі пасля ўступлення ў сілу зменаў у Закон аб СМІ.**

## УЗБУДЖЭННЕ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ СУПРАЦЬ ЖУРНАЛІСТА ПА АБВІНАВАЧАННІ Ў ДЗЯРЖАЎНАЙ ЗДРАДЗЕ




25 лістапада беларускія спецслужбы затрымалі ваеннага эксперта, аглядальніка газеты "Беларусы і рынак" Аляксандра Алесіна. Пра гэта стала вядома толькі на пачатку снежня, аднак ані прычынаў затрымання, ані месцазнаходжання журналіста Камітэт дзяржаўнай бяспекі не паведамляў. Пазней высветлілася, што ён знаходзіўся ў следчым ізалятары КДБ. 8 снежня блізкія Алесіна паведамілі, што яму прад'яўлена абвінавачанне ў здрадзе дзяржаве (арт. 356 КК РБ) і ўсталяванні супрацоўніцтва з спецслужбай органаў бяспекі або разведвальным органам замежнай дзяржавы (арт. 356-1 КК РБ).

Паводле словаў сваякоў, асноўным фігурантам па гэтай справе з'яўляецца не журналіст, а неназваны замежны дыпламат.

10 снежня А. Алесін быў вызвалены пад падпіску аб нявыездзе. Ён паведаміў, што абвінавачанне ў

здрадзе дзяржаве было з яго знятае, і цяпер яго абвінавачваюць толькі ў супрацы з замежнай спецслужбай.

Пасля вызвалення пад падпіску аб нявыездзе А. Алесін заявіў, што карыстаўся ў сваёй працы выключна адкрытымі крыніцамі, што пацвердзіцьме любая экспертыза.

## СУДОВЫ ПЕРАСЛЕД ЖУРНАЛІСТАЎ

Напрыканцы 2014 г. сталіся больш частымі выпадкі судовага пераследу журналістаў паводле стандартных абвінавачанняў ва ўдзеле ў несанкцыянаваных мерапрыемствах і супрацоўніцтве з замежнымі СМІ без акрэдытацыі.

У лістападзе былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці сямёра журналістаў і актывістаў, якія 5 лістапада сфатаграфаваліся ў Віцебску на фоне старога будынка з вядомым гарадскім графіці – выявай клетак, з якіх вылятаюць зробленыя з газеты птушкі, у падтрымку кампаніі «Станем за журналістыку!» Еўрапейскай федэрацыі журналістаў. Фотаздымкі былі размешчаныя на розных сайтах, што спрычыніла рэпрэсіі. Шасцёра ўдзельнікаў фотасесіі былі аштрафаваныя па абвінавачанні ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі на сумы ад 200 да 250 еўра (у эквіваленце) кожны, яшчэ адзін удзельнік акцыі – грамадзянскі актывіст – быў арыштаваны на 3 сутак. ЕФЖ выказала пратэст і ў знак



салідарнасці з беларускімі калегамі зладзіла падобную фотасесію ў Бруселі.

Паводле такога ж абвінавачання быў аштрафаваны на суму, тоесную 150 еўра, гарадзенскі журналіст Міхась Карневіч, афіцыйна акрэдытаваны ў Беларусі карэспандэнт “Радыё Свабода”. Ягоны рэпартаж з акцыі, прысвечанай памяці гістарычнага героя Беларусі Кастуся Каліноўскага, быў расцэнены як удзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве. У пратаколе міліцыі ўтрымлівалася наступная фармулёўка: “Знаходзіўся побач з помнікам і перасоўваўся ў складзе арганізаванай групы”.

Яшчэ чацвёра журналістаў у розных гарадах Беларусі былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці ў снежні за журналісцкую дзейнасць у інтарэсах замежных СМІ без акрэдытацыі паводле арт. 22.9 Кодэкса адміністрацыйных правапарушэнняў “Парушэнне заканадаўства аб СМІ”. Прычым Андрэй Мялешка быў аштрафаваны паводле гэтага артыкула трэці раз за год, а Алесь Залеўскі – другі.




**Да красавіка 2014 г. арт. 22.9 Кодэкса адміністрацыйных правапарушэнняў не застасоўваўся ў дачыненні да журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ, бо ён не прадугледжвае адказнасць за журналісцкую дзейнасць без акрэдытацыі.**

**Аднак у некаторых рэгіёнах міліцыя і суды адвольна прыраўнялі яе да незаконнага вырабу прадукцыі СМІ. Працягам 2014 г. было ўзбуджана 14 адміністрацыйных справаў супраць беларускіх журналістаў, якія рыхтуюць матэрыялы для замежных СМІ без акрэдытацыі Міністэрства замежных спраў. 10 са справаў скончыліся вынясеннем журналістам штрафаў ад 4,5 млн да 6 млн бел.рублёў (ад 350 да 450 еўра ў эквіваленце) кожнаму. Яшчэ адна справа будзе разгледжана ў 2015 годзе, а тры былі закрытыя праз сыход тэрміну прыцягнення да адказанасці.**

# РЭЙТЫНГІ, ІНДЭКСЫ, СТАТЫСТЫКА

У шосты раз запар Беларусь апынулася апошняй у рэйтынгу свабоды СМІ краінаў Усходняга партнёрства.

Паводле вынікаў апытання экспертаў за ліпень-кастрычнік 2014 г., Беларусь і Азербайджан папранейшаму маюць найгоршыя паказчыкі ў галіне свабоды СМІ сярод краінаў Усходняга партнёрства.

За два гады складання Індэкса свабоды медыя краінаў Усходняга партнёрства Беларусь так і не пакінула апошняе месца ў гэтым рэйтынгу. Прычым апытанне экспертаў ладзілася яшчэ да ўзбуджэння крымінальнай справы супраць журналіста Аляксандра Алесіна, унясення недэмакратычных паправак у закон “Аб сродках масавай інфармацыі” і масавага блакавання сайтаў Беларусі, інакш экспертныя ацэнкі становішча ў СМІ былі б яшчэ ніжэй.

Аналіз вынікаў апытання экспертаў паказвае, што найгоршым чынам на індэкс Беларусі ўплываюць рэпрэсіўнае заканадаўства ў галіне свабоды выказвання і поўны дзяржаўны кантроль над сферай тэлерадыёвяшчання.

EaP Media Freedom Watch

**Штоквартальнае складанне Індэкса свабоды медыяў Усходняга партнёрства з’яўляецца часткай праекту EaP Media Freedom Watch, які ажыццяўляецца МГА “Інтэрньюз-Украіна” у партнёрстве з няўрадавымі арганізацыямі пяці іншых дзяржаваў УП. Індэкс складаўся шляхам суміравання атрыманых краінамі-ўдзельніцамі балаў у чатырох катэгорыях: “Палітыка”, “Практыка”, “Тэлерадыёвяшчанне”, а таксама “Інтэрнэт і новыя СМІ”. Удзел у складанні рэйтынгу бяруць каля 60 экспертаў у галіне СМІ.**

## FREEDOM HOUSE ПРЫЛІЧВАЕ БЕЛАРУСЬ ДА КРАІНАЎ З НЕСВАБОДНЫМ ІНТЭРНЭТАМ

Згодна з дакладам міжнароднай праваабарончай арганізацыі Freedom House індэкс свабоды Інтэрнэту ў Беларусі ў 2014 годзе склаў 62 пункты. (Краіны з індэксам ад 0 да 30 пунктаў Freedom House адносіць да свабодных краінаў; ад 31 да 60 – да часткова свабодных; ад 61 да 100 – да несвабодных).

У 2013 годзе Індэкс свабоды Інтэрнэту ў Беларусі быў крышку ніжэйшы – 67 пунктаў. Freedom House адзначыў, што паляпшэнне сітуацыі ў Беларусі звязана галоўным чынам з тым, што палітычная абстаноўка была менш няўстойлівая і ўлады паслабілі кантроль за некаторымі абмежаваннямі.

Індэкс свабоды Інтэрнэту быў складзены да ўнясення папраўак у заканадаўства пра СМІ Рэспублікі Беларусь, якія рэзка ўзмацнілі дзяржаўны кантроль за Інтэрнэтам, і блакавання ў краіне некалькіх папулярных сайтаў.

ГА «БЕЛАРУСКАЯ
АСАЦЫЯЦЫЯ
ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.
Выдавец: ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (ГА «БАЖ »).
Вул. Камсамольская 7-32, 220030 Мінск, БЕЛАРУСЬ
Тэлефоны: +375 17 203-63-66, 226-70-98 Факс: +375 17 203-63-66, 226-70-98
E-mail: press@baj.by Web: www.baj.by
Кантакт: Бастунец Андрэй Леанідавіч, намеснік старшыні ГА «БАЖ »